# Псалмопевец Давид — поклонение



*Воздайте Господу, сыны Божии, воздайте Господу славу и честь, воздайте Господу славу имени Его; поклонитесь Господу в благолепном святилище Его.*

*Пошли свет Твой и истину Твою; да ведут они меня и приведут на святую гору Твою и в обители Твои.*

*И пойду я к жертвеннику Божию, к Богу радости и веселия моего, и на гуслях буду славить Тебя, Боже, Боже мой!*

*Кто изречет могущество Господа, возвестит все хвалы Его? Блаженны хранящие суд и творящие правду во всякое время!*

Библия в иллюстрациях. — М.: Свет на Востоке, 1991.

АіВ Адукацыя і Выхаванне

**Заснавальнік і выдавец — рэдакцыя часопіса "Адукацыя і выхаванне"**

*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 220-54-81, 220-54-10

Штоквартальны
навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

**1 (13) 2000**

# ГІСТОРЫЯ:
## праблемы выкладання

**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
М.І.Мініцкі
*Намеснік галоўнага рэдактара*
Н.М.Ганушчанка
*Адказны сакратар*
Р.Я.Грынкевіч

І.І.Багдановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
У.М.Міхнюк
С.В.Паноў
В.В.Сакалова
М.С.Сташкевіч
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава
А.А.Яноўскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. *Голенкова З.Т.* Гражданское общество в России // Обществознание в школе. — 1998. — № 2. — С. 9—10.

3. *Гонцова С.К., Панов С.В., Тумилович Г.Н., Секацкая К.И.* Стандарт образовательной области "История" // Гісторыя: праблемы выкладання. — 1999. — № 1.

4. *Данилов А.А., Косулина Л.Г.* История России. XX век: Учебник для 9 класса. — М.: Просвещение, 1998.

5. Изучение темы "Цивилизации прошлого" в курсе "Человек и общество" // Обществознание в школе. — 1998. — № 2.

6. *Карѣевъ Н.* Замѣтки о преподаванiи исторiи въ средней школѣ. — С.-П.: Типографiя И.Н.Скороходова, 1900.

7. *Кошелев В.С., Оржеховский И.В., Синица В.И.* Всемирная история нового времени: Учебник для 8 класса общеобразовательной школы / Под ред. В.С.Кошелева. — Минск: Нар. Асвета, 1998.

8. *Мишина И.А., Жарова Л.Н.* Становление современной цивилизации. Ч. 1. История раннего Нового времени (XVI—XVIII вв.): Учебное пособие для старших классов общеобразовательной школы / Отв. ред. С.Н.Мартынчук. — М.: Памятники исторической мысли, 1995.

9. Настаўніцкая газета. — 1999. — 19 жніўня.

10. Праграмы па гісторыі для агульнаадукацыйных школ. Праект / Пад рэд. У.С.Кошалева, М.С.Сташкевіча // Настаўніцкая газета. — 1999. — 11 верасня.

11. *Семенникова Л.И.* Цивилизации в истории человечества: Учебное пособие. — Брянск: Курсив, 1998.

12. *Хачатурян В.М.* История мировых цивилизаций с древнейших времен до начала XX века: Пособие для 10—11 классов общеобразовательных учебных заведений / Под ред. В.И.Уколовой. — М.: Дрофа, 1997.

13. *Шелохаев В.В.* Модернизация и тупики конфронтации между властью и обществом // Обществознание в школе. — 1998. — № 2.

история



9(07)+
БГПУ



# ПАЗНАВАЛЬНАЕ НАВУЧАННЕ І ДЫДАКТЫКА

*Іван Багдановіч, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя М.Танка*

## Да пытання аб удасканаленні выкладання гісторыі Беларусі

За прайшоўшыя пасля абвяшчэння суверэнітэту гады ў Беларусі зроблена вельмі многае ў справе вывучэння айчыннай гісторыі. Не маючы амаль ніякага вопыту ў галіне школьнага выкладання гісторыі шэраг беларускіх навукоўцаў-гісторыкаў стварылі і ў асноўных рысах рэалізавалі ў жыццё канцэпцыю школьнай гістарычнай адукацыі, падрыхтавалі і ўкаранілі ў навучальны працэс падручнікі, вучэбныя дапаможнікі па ўсіх курсах айчыннай гісторыі. Па водгуках настаўнікаў, іх якасць не горшая, а па асобных паказчыках і значна пераўзыходзіць лепшыя падручнікі савецкіх часоў. Вялікая заслуга ў гэтым такіх вядомых беларускіх гісторыкаў, як М.В.Біч, А.П.Жытко, П.А.Лойка, Я.К.Новік, М.С.Сташкевіч, У.Н.Сідарцоў, Ф.М.Фамін, Г.В.Штыхаў і інш., а таксама педагогаў-гісторыкаў С.В.Панова, У.К.Пляшэвіча, В.В.Ракуця і інш.

За апошнія 7—8 гадоў у нашай краіне выдадзены дзесяткі гістарычных даследаванняў манаграфічнага характару, навукова-папулярных кніг, сотні артыкулаў па праблемах гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Вялікую работу па навуковым забеспячэнні вык-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ладання айчыннай гісторыі выконваюць такія папулярныя сярод настаўнікаў выданні, як "Беларускі гістарычны часопіс" (галоўны рэдактар В.Ф.Кушнер) і "Гісторыя: праблемы выкладання" (галоўны рэдактар М.У.Міціцкі). У іх рэгулярна змяшчаюцца цікавыя навуковыя і навукова-метадычныя артыкулы па айчыннай гісторыі, па праблемах яе выкладання. Можна канстатаваць, што ў нашай краіне складваецца нацыянальная сістэма навукова-метадычнага забеспячэння вывучэння гісторыі Беларусі ў школе.

Пэўныя крокі зроблены ў забеспячэнні выкладання гісторыі Беларусі сродкамі навучання: створаны гістарычныя атласы і контурныя карты, першыя хрэстаматыі, зборнікі пазнавальных заданняў, рабочыя сшыткі, відэафільмы і камп'ютэрныя праграмы. Але іх стварэнне ідзе вельмі марудна — слабая фінансавая падтрымка з боку дзяржавы. Усе, што зроблена ў гэтым накірунку, з'яўляецца прадукцыяй камерцыйных фірм, каштуе дорага і таму ў навучальным працэсе выкарыстоўваецца абмежавана.

За такі кароткі час выканана вялікая работа, якая забяспечыла станоўчыя зрухі ў вывучэнні айчыннай гісторыі ў школах, у дасягненні той стратэгічнай мэты, якая вызначана ў канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі і дзеючых праграмах: выхаванне чалавека-грамадзяніна, добрага гаспадара на сваёй зямлі, з уласцівым яму пачуццём гонару і годнасці за прыналежнасць да свайго народа, які шануе сваю мову, культуру і традыцыі, адчувае адказнасць за лёс Бацькаўшчыны. Сучасны стан школьнага выкладання айчыннай гісторыі сведчыць аб неабходнасці далейшага ўдасканалення і вырашэння многіх тэарэтычных і практычных пытанняў, звязаных з навукова-метадычным забяспячэннем навучальнага працэсу. У агульным плане іх можа прадставіць у наступным выглядзе:

1. **Далейшай распрацоўкі патрабуюць пытанні тэорыі і методыкі выкладання гісторыі.** У прыватнасці, неабходна абгрунтаваць:

⊕ *канцэнтрызм у навучанні гісторыі і асаблівасці спалучэння эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў пазнання на розных ступенях навучання;*



⊕ *узаемасувязь айчыннай і сусветнай гісторыі і яе ажыццяўленне праз міжкурсавыя і ўнутрыкурсавыя сувязі;*

⊕ *шляхі спалучэння фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў пры адборы зместу гістарычнага матэрыялу школьнага курса айчыннай гісторыі (сучасны змест айчыннай гісторыі грунтуецца на традыцыйным для марксісцкай гістарыяграфіі фармацыйным тлумачэнні гістарычнага працэсу);*

⊕ *новыя падыходы да перыядызацыі айчыннай гісторыі (адмовіўшыся ад выкарыстання перыядызацыі расійскай гісторыі, якую механічна перанеслі на гісторыю Беларусі).*

2. **Павінна працягвацца работа па далейшым удасканаленні падручнікаў.** Трэба мець на ўвазе, што падручнік — навукова-папулярнае выданне па гісторыі. Мова яго павінна быць эмацыянальнай, вобразнай, уздзейнічаць не толькі на свядомасць, але і на пачуцці вучняў, асабліва пры асвятленні галоўных фактаў і падзей айчыннай гісторыі, характарыстык выдатных гістарычных дзеячаў і асоб. У дзеючых падручніках пераважае канспектыўнае павестванне, а галоўныя факты і падзеі не заўсёды вылучаюцца з агульнага патоку інфармацыі. Патрабуе дапрацоўкі ілюстрацыйны матэрыял, бо яго адсутнасць пазбаўляе настаўнікаў магчымасці арганізаваць аналітыка-сінтэтычную пазнавальную дзейнасць пры вывучэнні важнейшых з'яў і падзей айчыннай гісторыі.

3. **Патрабуе вырашэння праблема далейшага забеспячэння курса айчыннай гісторыі сродкамі навучання:**

⊕ хрэстаматыямі па гісторыі Беларусі, асабліва для X—XI класаў, дзе адбываецца тэарэтычнае асэнсаванне гістарычнага шляху беларускага народа. Адбор дакументаў для арганізацыі самастойнай работы вучняў павінен быць зроблены так, каб ствараліся ўмовы для разважання і дыскусіі, плюралізму думак, меркаванняў і выказванняў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

⊕ мастацка-гістарычнымі хрэстаматыямі для V—IX класаў, з уключэннем у іх вуснай народнай творчасці, паданняў, прыказак, прымавак і іншых этнаграфічных матэрыялаў, фрагментаў гістарычнай белетрыстыкі;

⊕ кнігамі для чытання, у якіх змясціць найбольш цікавыя і даступныя школьнікам навукова-папулярныя артыкулы гісторыкаў аб важнейшых падзеях і асобах беларускай гісторыі. Яны маглі б стаць цудоўным матэрыялам для самастойнай падрыхтоўкі вучнямі рэфератаў, дакладаў і паведамленняў, пашырэння і паглыблення ведаў па айчыннай гісторыі.

4. **Эфектыўным сродкам паляпшэння якасці вывучэння айчыннай гісторыі можа стаць аднаўленне краязнаўчай і экскурсійнай работы ў школах нашай краіны**, тым больш, што Беларусь у недалёкім мінулым мела добрыя традыцыі гісторыка-краязнаўчай работы. У школах рэспублікі захаваліся з савецкіх часоў тысячы школьных музеяў, якія зараз фактычна не дзейнічаюць. Рэканструкцыя і аднаўленне іх дзейнасці, а таксама дзейнасці археалагічных, этнаграфічных і краязнаўчых гурткоў, арганізацыя і правядзенне алімпіяд і конкурсаў сачыненняў па гісторыі Беларусі, безумоўна, спрыялі б рэалізацыі задач патрыятычнага і маральнага выхавання школьнікаў сродкамі гісторыі.

5. **Мовай выкладання айчыннай гісторыі павінна быць выключна беларуская** (гэта асабліва актуальна ва ўмовах, калі яна фактычна выцясняецца з агульнаадукацыйнай школы). Гэта не супярэчыць зменам, якія ўнесены ў Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь, што прадугледжвае вывучэнне беларускай і рускай моваў ва ўсіх тыпах школ краіны. Нельга выхаваць свядомага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь без ведання мовы тытульнай нацыі. Безумоўна, што вучэбныя дапаможнікі і метадычная літаратура па айчыннай гісторыі таксама павінны выдавацца па-беларуску. У апошні час назіраецца негатыўная тэндэнцыя да пераходу на рускую мову выкладання і да выдання вучэбнай літаратуры на рускай мове, што, на наш погляд, наносіць шкоду вырашэнню адукацыйна-выхаваўчых задач, якія вызначаны ў школьных праграмах па гісторыі Беларусі.



методика преподавания в средней школе истории; БГПУ; Беларусь

БГПУ + 9(07)

***Николай Миницкий**, кандидат исторических наук, доцент кафедры всеобщей истории Белорусского государственного педагогического университета им. М.Танка*

# Вербальное и визуальное представление исторического знания: типы и виды когнитивных моделей в учебнике

*Цель данной публикации — ознакомить учителей истории с вербально-логической и визуально-пространственной формами представления информации в учебной литературе по истории. На страницах журнала "Гісторыя: праблемы выкладання" такого рода материалы неоднократно помещались и ранее. Это методические разработки по конструированию и применению знаково-символьных средств в преподавании истории. Они принадлежат учителям-методистам В.Лебедевой и И.Короткевич (Опорный конспект по истории. — 1998. — № 3), а также В.Ракутю (Нетрадыцыйныя сродкі навучання. — 1999. — № 3). Аналогичного характера работа представлена старшим научным сотрудником лаборатории исторического и социально-экономического образования НИО С.Пановым (Структурна-лагічныя схемы як аснова рэалізацыі камп'ютэрных тэхналогій пры навучанні гісторыі. — 1997. — № 1).*

*Вопросам теоретического обоснования знаково-символьных дидактических средств была посвящена статья "Знак и символ в историческом исследовании и обучении" (1998, № 1) автора данной публикации. Интенсивно развивающаяся отечественная и зарубежная практика в обозначенном направлении побудила нас вновь обратиться к этой теме.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ